рэнняў (паляпшэнне культуры земляробства, арганізацыя саматужных арцеляў і перасяленняў) разам з захаваннем памешчыцкага землеўладання і сял. абшчыны. Аўтар падручнікаў па статыстыцы, прац па палітэканоміі, агр. пытаннях, чыг. гаспадаркі («Чыгуначная гаспадарка», т. 1—2, 1875—78; «Пра характар і прычыны сучаснага прамысловага крызісу ў Заходняй Еўропе», 1889; «Пра эканамічнае значэнне адукацыйных і выхаваўчых устаноў для рабочага класа», 1898, і інш.). Адзін з рэдактараў і аўтараў зб. «Уплыў ураджаяў і хлебных цэн на некаторыя бакі рускай народнай гаспадаркі» (1897). *Н.К.Мазоўка.*

**ЧУПРЫГІНА** Людміла Графімаўна (н. 20.5.1938, в. Прусы Капыльскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне інфарматыкі. Скончыла БДУ (1960). З 1960 у НДІ ЭВМ (у 1974—94 нач. аддзела). Навук. працы па сістэмным праграмным забеспячэнні ЭВМ, аперацыйных сістэмах ДОС і ОС для ЭВМ Адзінай сістэмы. Кіраўнік распрацоўкі праграмнага забеспячэння сістэмы раздзялення часу, дысплейных комплексаў ЕС 7920, «Сегмент», «Эдэльвейс». Дзярж. прэмія СССР 1978. *М.П.Савік.*

**ЧУР** Мікалай Мікалаевіч (н. 19.8.1948, г. Вілейка Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1999). Скончыў Віцебскі мед. ун-т (1972). З 1975 у Мінскай абл. клінічнай бальніцы. З 1995 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Асн. навук. працы па лячэнні хворых з сіндромам дыябетычнай ступні, малаінвазійных метадах лячэння астаткавых гнаінікоў брушной поласці.

*Тв.:* Обоснование путей улучшения результатов лечения синдрома диабетической стопы // Актуальные вопросы эндокринологии. Мн., 1999; Синдром диабетической стопы. Мн., 2000 (разам з І.М.Грышыным); Ранние послеоперационные осложнения прободных пилородуоденальных язв и их лечение (у сааўт.) // Третий конгресс Ассоциации хирургов им. Н.И.Пирогова. М., 2001.

**ЧУРА́БА** Мікалай Дзмітрыевіч (24.12.1913, Мінск — 29.1.1998), бел. мастак. Скончыў Маскоўскі маст. ін-т імя В.Сурыкава (1940). У 1966—82 выкладаў у Брэсцкім інж.-буд. ін-це. Працаваў у кніжнай і станковай графіцы, жывапісе. Творы адметныя грамадзянскасцю і патрыятызмам, дакладнасцю малюнка, гарманічным каларытам, выразнасцю пластычнай формы. Сярод графічных твораў: «Док рыбкалгаса. Ейск» (1937), трыпціх «Абарона Брэсцкай крэпасці» (1949), цыкл «Мой родны Брэст» (1958), «Я.Колас у дзяцінстве» (1959), партрэты герояў Брэсцкай крэпасці (1965). Аўтар жывапісных работ «Цаною жыцця» (1961), «У Брэсцкай крэпасці» (1964), «Руіны парахавога склада» (1969), трыпціха «На парозе бессмяротнасці» (1971), «Смага» (1979), «Зноў згушчаюцца хмары» (1983). Пісаў таксама партрэты («У сваёй майстэрні»), нацюрморты. Аформіў кнігі «Вершы для дзяцей» М.Лужаніна (1948), «Залаты карп» А.Стаховіча (1951), «Новая зямля» Я.Коласа (1958) і інш. *Л.Ф.Салавей.*



М.**Чураба**. У сваёй майстэрні.

**ЧУ́РКІН** Аскольд Мікалаевіч (27.1.1930, Мінск — 17.6.1985), бел. графік. Сын М.М.*Чуркіна*. Скончыў БДУ (1955). У 1959—73 маст. рэдактар час. «Вожык», у 1979—84 час. «Беларусь». Працаваў у кніжнай графіцы і плакаце. Аўтар карыкатур на быт., паліт., вытв. тэмы ў бел. і замежным перыяд. друку: «На адным заводзе» (1955), «Колькі галасоў атрымаў прэзідэнт?» (1957), «Графік гультая» (1958), «Дазвольце прыкурыць» (1962), «У нас сапраўдная дэмакратыя» (1966); плакатаў «25 гадоў СЭУ» (1974), «Агульны рынак», «Мы з вамі, патрыёты Чылі» (абодва 1976). Выдаў зб-кі карыкатур «Мае альбомы» (1967), «Твар свабоднага свету» (1983) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

**ЧУ́РКІН** Мікалай Мікалаевіч (21.5.1869, г. Сцепанаван, Арменія — 27.12.1964), бел. кампазітар, фалькларыст; адзін з заснавальнікаў бел. прафес. музыкі. Нар. арт. Беларусі (1949). Скончыў Тбіліскае муз. вучылішча Рус. муз. т-ва (1892, кл. М.*Іпалітава-Іванава*), Пецярбургскую АМ (1899). З 1898 настаўнічаў, кіраваў аматарскімі хар. калектывамі ў Баку, з 1903 у Каўнасе, з 1905 у Вільні. З 1924 на Беларусі, працаваў педагогам настаўніцкай семінарыі, агульнаадук. школ, заг. муз. падсекцыі павятовага выканкома, арганізатарам маст. самадзейнасці ў г. Мсціслаў. З 1924 выкладчык пед. тэхнікума ў Магілёве, з 1935 у Мінску. Яго музыка адметная аптымізмам, строгай класічнай формай, меладычнасцю, апорай на бел. муз. фальклор. Збіраў муз. фальклор (запісаў больш за 3000 бел., груз., арм., азерб., польскіх, літ., тадж. песень і танцаў). Сярод твораў: оперы «Вызваленне працы» (паст. 1922), «Раскіданае гняздо» паводле Я.Купалы (клавір, 1959—64), радыёопера для дзяцей «Рукавічка» (паст. 1948); муз. камедыі «Кок-сагыз» (паст. 1939), «Песня Бярэзіны» (паст. 1947); 3 сімфаньеты (1925, «Беларускія карцінкі»; 1949, 1955), уверцюра «Памяці Янкі Купалы» (1952) для арк. бел. нар. інструментаў, сюіты для сімф. і нар. аркестраў, 11 стр. квартэтаў, хары, рамансы, песні для дзяцей на словы бел. паэтаў, музыка да драм. спектакляў. Апрацоўваў нар. песні і танцы (53 бел. нар. мелодыі ў яго запісе і апрацоўцы змешчаны ў «Беларускім зборніку» Е.Раманава, вып. 7, 1910). Складальнік зб-каў «Беларускія народныя песні і танцы» (1949) і «Беларускія народныя песні» (1959).

*Літ.:* Журавлев Д.Н. Большая дорога: Народный артист БССР Н.Н.Чуркин. Мн., 1964. *Дз.М.Жураўлёў.*

**ЧУРКО́** Леанард Васілевіч (10.6.1931, Мінск — 26.2.1983), бел. графік. Скончыў Маскоўскі паліграф. ін-т (1962). Працаваў у станковай, кніжнай, прамысл. графіцы, плакаце. Творы вылучаюцца дакладнасцю кампазіцыі, востраxарактарнасцю вобразаў: лісты «Літоўка», «Рыбны порт», «Клайпеда. Стары дворык» (усе 1966), «Грывога» (1967), «Мінск пасля дажджу», «Браслаў», «Новалукомль» (усе 1969), «Калгас «Новы быт» (1970); карыкатуры «Набіваюць цану» (1963), «Заатэхнік» (1964), «Узаемнае віншаванне» (1965) і інш. Аформіў кнігі «Школьны каляндар прыроды» А.Курскова (1969), «Клятва» М.Гяславані (1970), «А дзе ж тая крынічанька» (1972) і «Як я вучыўся жыць» (1974) Н.Гілевіча, «Беларускі народны танец» Ю.Чурко (1972), «Шчырасць» А.Лойкі, «Грыбная пара» А.Грачанікава (абедзве 1973) і інш. *Л.Ф.Салавей.*

**ЧУРКО́** Юлія Міхайлаўна (н. 21.7.1936, С.-Пецярбург), бел. балерына, мастац-



Л.**Чурко**. Агітплакат. 1971.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

твазнавец, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1991). Д-р мастацтвазнаўства (1972). Праф. (1974). Скончыла Бел. харэаграфічнае вучылішча (1954), БДУ (1960). У 1954—61 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. З 1963 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, выкладчык Бел. кансерваторыі, з 1972 заг. кафедры Мінскага пед. ін-та, з 1979 Бел. ін-та культуры (да 1995), адначасова з 1994 у Бел. акадэміі музыкі (з 1995 заг. кафедры). Сярод выкананых партый: Гамзаці («Баядэрка» Л.Мінкуса), Насця («Падстаўная нявеста» Г.Вагнера) і інш. Працы па гісторыі і тэорыі бел. харэаграфіі, нар. танца: «Беларускі балет» (1966), «Беларускі сцэнічны танец» (1969), «Беларускі народны танец» (1972), «Беларускі балетны тэатр» (1983), «Беларускі балет у асобах» (1988), «Беларускі харэаграфічны фальклор» (1990), «Лінія, што ідзе ў бясконцасць» (1999), сааўтар кніг «Музычны тэатр Беларусі, 1917—1959» (1993), «Музычны тэатр Беларусі,1960—1990: Балет...» (1997). Аўтар лібрэта да балетаў «Мефіста» У.Кандрусевіча і «Кругаверць» А.Залётнева (адначасова адзін з пастаноўшчыкаў) і інш. Арганізатар і кіраўнік н.-д. лабараторыі танц. творчасці пры Мінскім ін-це культуры (1980—90). Аўтар сцэнарыяў, у т.л. дакумент. тэлефільмаў, вядучая тэлеперадач пра мастацтва танца. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

*Літ.*: Ю.М.Чурко: Бібліягр. паказ. Мн., 1998.

**ЧУРЛЁНІС** (Čiurlionis) Мікалоюс Канстанцінас (22.9.1875, г. Варэна, Літва — 10.4.1911), літоўскі жывапісец і кампазітар; прадстаўнік сімвалізму. Вучыўся ў рысавальнай школе Я.Каўзіка (1902—05) і маст. вучылішчы (1905) у Варшаве. Вывучаў музыку ў Варшаўскім муз. ін-це (1894—99) і Лейпцыгскай кансерваторыі (1901—02). Чл. аб'яднання «Свет мастацтваў» (1911). У аснове яго твораў «нар. рамантыка» літоўскага фальклору, у позні перыяд прасочваюцца аналогіі музыкі і выяўл. мастацтва. Творчая манера вылучаецца своеасаблівай абагульненасцю, вытанчаным каларытам: жывапісныя кампазіцыі «Саната вясны», «Саната сонца» (абодва 1907), «Саната мора», «Саната зорак» (абодва 1908), трыпціх «Казка» (1907), цыклы «Стварэнне свету» (1904—06), «Казка каралёў», «Знакі задыяка», «Вясна», «Зіма» (усе 1907), «Жэмайскія крыжы» (1909).



М.К.Чурлёніс. Саната зорак. 1908.



М.К.**Чурлёніс**.

Муз. творчасць Ч. адносіцца да неарамантызму, звязана з літ. фальклорам. Аўтар першых літ. сімф. паэм («У лесе», 1900; «Мора», 1907), стр. квартэта, больш як 200 твораў для фп. і інш. Запісваў і гарманізаваў мелодыі літ. нар. песень. З 1965 у Літве праводзіцца конкурс выканаўцаў імя Ч. (з 1991 міжнар.). Мемар. музеі ў гарадах Каўнас і Друскінінкай.

*Літ.*: Ч ю р л е н и т е Я.К. Воспоминания о М.К.Чюрленисе: Пер. с лит. Вильнюс, 1975; Л а н д с б е р г и с В.В. Творчество Чюрлениса. 2 изд. Л., 1975.

**ЧУРСІНА** Людміла Аляксееўна (н. 20.7.1941, Душанбе), расійская актрыса. Нар. арт. СССР (1981). Скончыла Тэатр. вучылішча імя Б.Шчукіна (1965). З 1963 у Т-ры імя Я.Вахтангава, у Т-ры-студыі кінаакцёра пры кінастудыі «Ленфільм», з 1974 у Ленінградскім т-ры драмы імя А.Пушкіна, з 1984 у Цэнтр. т-ры Рас. Арміі. Яе творчай манеры ўласціва імкненне да стварэння складаных вобразаў, паказу развіцця характару ў барацьбе з сабой і знешнімі абставінамі: Ліза («Дзеці сонца» М.Горкага), Саша («Іванаў» А.Чэхава), Настасся Піліпаўна («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), імператрыца Марыя Фёдараўна («Павел І» Дз.Меражкоўскага), лэдзі Макбет («Макбет» У.Шэкспіра). З 1961 здымаецца ў кіно: «Данская аповесць» (1965), «Угрум-рака» (тэлефільм), «Журавушка» (прыз Міжнар. кінафестывалю ў Сан-Себасцьяне), «Вірынея» (усе 1969), «Любоў Яравая» (1970, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах), «Алеся» (1971), «Прывалаўскія мільёны» (1973), «І гэта ўсё пра яго» (1977, тэлефільм), «Факты мінулага дня» (1981), «Каханне немаладога чалавека» (1990), «Графіня», «Справа Сухаво-Кабыліна» (абодва 1991), «Хагітрагер» (1994), «Чорны пакой» (2000, тэлесерыял) і інш. Дзярж. прэмія Расіі 1970.

*Літ.*: Актеры советского кино. Вып. 7. М., 1971.



Да арт. **Чурыгера**. Х.Б. дэ Ч у р ы г е р а. Рэтабла касцёла Сан-Эстэбан у г. Саламанка. 1693—96.

**ЧУРЫГЕРА** (de Churriguera), іспанскія архітэктары і скульптары 17—18 ст.; браты. Х а с э  Б е н і т а  д э  Ч. (21.3.1665, Мадрыд — 2.3.1725) у пабудовах, алтарных кампазіцыях і алтарах-рэтабла спалучаў прыёмы барока з матывамі готыкі і платэрэска, ужываў мудрагелістую арнаментыку, выгнутыя хвалепадобныя карнізы, калоны, пышны скульпт. дэкор: рэтабла касцёла Сан-Эстэбан у г. Саламанка (1693—96), палац у Мадрыдзе (пасля 1689, перабудаваны ў 1774; цяпер Каралеўская акадэмія прыгожых мастацтваў Сан-Фернанда), план г. Нуэва-Бастан з палацам, касцёлам і фабрыкай (1709—13). Яго імем названы ісп. варыянт барока 17—18 ст. — стыль чурыгерэска. У Саламанцы працавалі таксама Х а а к і н (1674—1724) і А л ь б е р т а (1676—1740).

**ЧУРЫКАВА** Іна Міхайлаўна (н. 5.10.1943, г. Белебей, Башкортастан), расійская актрыса. Нар. арт. СССР (1991). Скончыла Тэатр. вучылішча імя М.Шчэпкіна (1965). У 1965—68 у Маскоўскім т-ры юнага гледача. З 1973 у т-ры «Ленком». Яе мастацтву ўласцівы спалучэнне драм. і камед., лірычнага і эксцэнтрычнага пачаткаў, схільнасць да вострасюжэтнай трактоўкі вобразаў класічнай драматургіі: Сара, Аркадзіна («Іванаў», «Чайка» А.Чэхава), Афелія («Гамлет» У.Шэкспіра), Бабуленька («Варвар і ерэтык» паводле рамана Ф.Дастаеўскага «Гулец»), Філумена («Горад мільянераў» паводле п'есы Э.Дэ Філіпа «Філумена Мартурана»). З 1961 здымаецца ў кіно: «Хмары над Борскам» (1961), «У агні броду няма» (1968), «Пачатак» (1970), «Прашу слова» (1976), «Той самы Мюнхгаўзен» (1979, тэлефільм), «Тэма» (1979, вып. 1987), «Валянціна» (1981),

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ